# Начальнік Ядрышчэнскі Дзмітрый Уладзіміравіч



**Асноўнай задачай сектара з'яўляецца:**

забеспячэнне рэгулявання ў межах кампетэнцыі сектара дзейнасці арганізацый, якія складаюць сістэму Міністэрства, у галіне кіравання дзяржаўнай маёмасцю, эфектыўнага выкарыстання і захаванасці замацаванага за арганізацыямі на праве гаспадарчага ведання або аператыўнага кіравання, а таксама перададзенай у бязвыплатнае карыстанне дзяржаўнай маёмасці, унясенне прапаноў па кіраванні прыналежнымі Рэспубліцы Беларусь і перададзенымі ва ўпраўленне Міністэрства акцыямі (долямі ў статутных фондах) недзяржаўных юрыдычных асоб.

**Для рэалізацыі асноўнай і іншых задач сектар распараджэння дзяржаўнай маёмасцю выконвае наступныя функцыі:**

метадычнага кіраўніцтва па кіраванні дзейнасці арганізацый, якія складаюць сістэму Міністэрства, па пытаннях распараджэння дзяржаўнай маёмасцю, у тым ліку, перададзенай у бязвыплатнае карыстанне;
ажыццяўляе аналіз эфектыўнасці выкарыстання дзяржаўнай маёмасці арганізацыямі, якія складаюць сістэму Мінсувязі;
прымае меры па забеспячэнні эфектыўнага выкарыстання і захаванасці дзяржаўнай маёмасці замацаванай за арганізацыямі, якія складаюць сістэму Міністэрства;
кантралюе прадстаўленне арганізацыямі ў Дзяржаўны камітэт па маёмасці Рэспублікі Беларусь звестак аб дзяржаўнай маёмасці для рэгістрацыі яе ў Адзіным рэестры маёмасці, правядзенне арганізацыямі дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці ў Адзіным дзяржаўным рэгістры нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй;
ажыццяўляе метадычнае кіраўніцтва па выкананні прадстаўнікамі дзяржавы ў гаспадарчых таварыствах, акцыі якіх належаць Рэспубліцы Беларусь і перададзены ва ўпраўленне Міністэрства нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць пытанні ўладальніцкага нагляду;
падрыхтоўвае праекты рашэнняў аб назначэнні прадстаўнікоў дзяржавы ў органах кіравання гаспадарчых таварыстваў, акцыі якіх належаць Рэспубліцы Беларусь і перададзены ва ўпраўленне Міністэрства;

забяспечвае прадстаўленне ва ўстаноўленым парадку ведамаснай справаздачнасці па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю сектара;
падрыхтоўвае адказы на звароты грамадзян і юрыдычных асоб па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю сектара, вывучае і аналізуе прычыны ўзнікнення гэтых зваротаў, прымае меры па іх устараненню;
распрацоўвае самастойна або сумесна з іншымі структурнымі падраздзяленнямі цэнтральнага апарата Міністэрства праекты нарматыўных прававых актаў і іншых дакументаў па пытаннях, якія адносяцца да кампетэнцыі сектара, і ажыццяўляе кантроль за іх прымяненнем;
ажыццяўляе ўзаемадзеянне са структурнымі падраздзяленнямі цэнтральнага апарата Міністэрства, структурнымі падраздзяленнямі дзяржаўных органаў (арганізацый), арганізацый, якія складаюць сістэму Міністэрства па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю сектара;
уносіць прапановы ў сектар кадравай работы цэнтральнага апарата Міністэрства па падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі спецыялістаў цэнтральнага апарата Міністэрства па пытаннях, якія адносяцца да кампетэнцыі сектара;
забяспечвае абарону дзяржаўных сакрэтаў у сваёй дзейнасці.
у межах кампетэнцыі прымае ўдзел у зацвярджэнні прагнозаў развіцця камерцыйных арганізацый на пяць гадоў, бізнес-планаў развіцця гэтых арганізацый на год, а таксама кантролі за іх выкананнем;
падрыхтоўвае рашэнні аб стварэнні і спыненні дзейнасці падпарадкаваных дзяржаўных арганізацый;
рыхтуе матэрыялы для калегій Міністэрства па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю сектара.

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/nachalnik-yadryshchenski-dzmitryy-uladzimiravich*